**Заданні, якія дазваляюць сфарміраваць вопыт разважання пры рашэнні нестандартных задач – жыццёвых сітуацый**
**Тэма: “Жывёлы”**

***Стымул.*** У школе ў жывым кутку жывуць: заяц, вожык, пацук, курыца, чарапаха і ліса.

***Задачная фармуліроўка.*** Размясціце ўсіх гэтых жывёл на начлег у вальеры і накарміце іх, выконваючы наступныя патрабаванні:

1. Размясціце жывёл у вальерах так, каб яны не з’елі адзін аднаго: вальер усяго пяць, а жывёл шэсць.
2. Пакладзіце па два прадукты харчавання ў кожную вальеру (піццём жывёлы забяспечаны).

Запоўніце табліцу

| | Вальера №1 | Вальера №2 | Вальера №3 | Вальера №4 | Вальера №4 |
|---|---|---|---|---|---|
| Жывёла ці жывёлы | | | | | |
| Корм 1 | | | | | |
| Корм 2 | | | | | |
| Піццё | вада | вада | вада | вада | вада |

***Інфармацыя аб жывёлах***



*Трус* – раслінаедная жывёла. Трус есць моркву, буракі, бульбу, лісце капусты, збожжа. Для папярэджання страўнікавых захворванняў трусам неабходна даваць травы (дзьмухавец, трыпутнік, палын і іншыя).



*Вожык* – насякомаедная жывёла. У прыродзе ён есць жукоў і іх лічынкі, вусеняў, чарвякоў, яйкі дробных птушак, нярэдка ловіць мышэй. Вядомы выпадак, калі ў няволі вожык з’еў гадзюку.



*Пацук* – усёедная жывёла. Есць збожжа, садавіну і гародніну. У прыродзе пацукі нападаюць на дробных жывёл і птушак, цягаюць з хлявоў маленькіх трусаў, куранят і яйкі, прадукты з дамоў і свіраноў, знішчаюць ўраджай на палях.



*Курыца* – пераважна раслінаедная птушка. Курэй кормяць збожжам, гароднінай (капустай, морквай, бульбай, буракамі і інш.), травой. Акрамя гэтага куры ядуць чарвякоў і насякомых.



*Чарапаха* – раслінаедная жывёла. Яна жыве ў стэпах, пустынях і паўпустынях Азіі. У прыродзе чарапахі сілкуюцца раслінамі пустыні, кавунамі і дынямі, ягадамі, садавіной. У няволі іх кормяць лісцем капусты, дзьмухаўцоў і канюшыны, гарбузом, агуркамі, яблыкамі і інш.



*Ліса* – тыповы драпежнік, у прыродзе есць грызуноў (мышэй і пацукоў), зайцоў, жаб, яшчарак і інш. У няволі яе кормяць мясам, яйкамі, малаком.

***Корм для жывёл***










мяса капуста малако зерне морква трава

***Мадэльны адказ***

Корм:

Ліса – мяса, малако; вожык – мяса, малако; пацук – любыя два прадукты харчавання (мяса, малако, капуста, зерне, морква, трава); трус – два любыя прадукты расліннага паходжання; курыца – два любыя прадукты расліннага паходжання; чарапаха – два любыя прадукты расліннага паходжання.

Парамі можна пасяліць: трус – курыца; курыца – чарапаха; трус – чарапаха; вожык – чарапаха.

| | |
|---|---|
| Правільна падабраны корм для жывёл (для кожнай жывёлы – па 0,5 бала) | 3 балы |
| Правільна паселены пары жывёлаў у вальеры | 3 балы |
| ***Максімальны бал*** | ***6 балаў*** |